**УДК 94 (476):39 (=161.3)**

# ФОРМЫ САМАВЫЗНАЧЭННЯ І САМАСВЯДОМАСЦІ ПРЫВІЛЕЯВАНАГА САСЛОЎЯ Ў БЕЛАРУСІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ

***С.А. ШЫДЛОЎСКІ***
***(Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Мінск)***

*Разгледжана праблема этнічнай самаідэнтыфікацыі прывілеяванага саслоўя ў Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Зроблены высновы аб важнай ролі шляхецкай інтэлігенцыі ў фармаванні нацыянальнай беларускай ідэнтычнасці.*

Уваходжанне Беларусі ў склад Расійскай Імперыі прыпала на эпоху «абуджэння народаў». Энтані Сміт характарызуе дадзены перыяд (ад 1750-х і да канца панавання Напалеона) як першую стадыю этнічнага ўздыму ў Еўропе [1, с. 17]. Гэта быў час нараджэння нацыянальнай ідэі (Русо, Гердэр), заснаванай на прынцыпе міжсаслоўнай салідарнасці, і фармавання нацыянальных рухаў, з'яўленню якіх спрычыніліся мадэрнізацыйныя змены ў сацыяльнай структуры і эканоміцы еўрапейскіх краінаў. Абавязковым для ідэнтычнасці нацыянальнага тыпу зрабілася ўяўленне аб ідэалагічнай радзіме – «веды пра геаграфічны абшар айчыны, колькасць суайчыннікаў, этнагенетычны міф, галоўныя этапы гісторыі і культ нацыянальных герояў» [2].

З'яўленню ўласнабеларускага нацыянальнага руху папярэднічала «адкрыццё» беларускага этнасу, якое адбывалася пры ўдзеле палітычных і навуковых колаў суседніх народаў. Пад «адкрыццём» разумеецца шэраг навуковых і грамадска-палітычных прэцэдэнтаў: прызнанне моўнай самабытнасці беларускага сялянства, вызначэнне генетычнай сувязі беларускай гутарковай мовы з мовай афіцыйнага справаводства Вялікага княства Літоўскага і пераемнасці гісторыі беларускага народу з дзяржаўнай спадчынай крывічоў, апазнаванне канфесійнай гетэрагеннасці беларускага этнасу, геаграфічная лакалізацыя тэрміна «Беларусь» ды ін., якія ў сваёй сукупнасці легітымізавалі беларускі дыскурс.

Варта зацеміць, што вышзгаданыя крокі не праводзіліся сістэмна з мэтай інспірацыі беларускага сепаратызму, але насамрэч умажлівілі яго з'яўленне. «Адкрыццё» спрыяла не толькі аб'ектыўнаму выяўленню самабытных рысаў беларускага этнасу, але і само ў пэўнай ступені спрычынілася да канструявання дадзенай супольнасці, якая на той час заставалася падзеленая на саслоўныя, канфесійныя і рэгіянальныя групы, якім бракавала адчування агульнай тоеснасці.

Кожная супольнасць прэтэндавала на пэўную культурную універсальнасць і патэнцыйна магла зрабіцца ядром агульнанацыянальнай кансалідацыі. З шэрагу адукаванага насельніцтва найбольш падрыхтаванымі да спачування беларускай нацыянальнай ідэі былі выхадцы з уніяцкага святарства, але дадзеная сацыяльная група з'яўлялася дэмаралізаванай і маргіналізаванай. Больш пасавала роля нацыянальных будзіцеляў шляхце як найбольш мабільнай і палітычна актыўнай сацыяльнай групе. Але да скасавання прыгоннага права ў 1861 годзе сялянства на беларускіх землях не разглядалася як суб'ект грамадска-палітычных адносінаў, існаваў псіхалагічны бар'ер, што перашкаджаў дэнацыяналізаванай тутэйшай шляхце ўсведамляць сваю этнічную адзінакрэўнасць з простым народам. Эканамічная мяжа паміж сялянствам і шматлікай шляхтай-галотай была настолькі вузкай, што змушала апошнюю да адмысловых стратэгій культурнага адасаблення, каб захоўваць бачнасць сваёй вышэйшасці. Вымога дакументальна даводзіць перад расійскім урадам правы на шляхецтва пад пагрозай пераходу ў падатковае саслоўе таксама не спрыяла дэманстрацыі салідарысцкіх пачуццяў з сялянствам. Гэтыя і шэраг іншых чыннікаў, якія вынікалі з гістарычнага перыяду, што папярэднічаў падзелам Рэчы Паспалітай, абумовілі амбівалентны характар удзелу шляхецтва ў беларускім руху.

Шляхта была дзяржаватворчай «нацыяй» Рэчы Паспалітай: «права яе продкаў не прызнавала ні пана, ні мужыка, ні мешчаніна, а толькі шляхціца... яно не літавала нават караля – толькі шляхту, толькі шляхта была ўсім і ўсё было для яе» [3, с. 186]. У феадальных грамадствах, варта ўдакладніць, пад «нацыяй» разумелася сукупнасць прывілеяваных саслоўяў, часцяком этнічна неаднародная [4, с. 32]. Рэч Паспалітую двух народаў, як вынікае з самой назвы дзяржавы, складалі дзве палітычныя нацыі – шляхта Польскага каралеўства і шляхта Вялікага княства Літоўскага.

Ліцвінская шляхта з'яўлялася часткай мультыэтнічнага прывілеяванага саслоўя Рэчы Паспалітай. Як лічыць Ю. Бардах, у XVIII стагоддзі ў Рэчы Паспалітай сфармавалася шматузроўневая нацыянальная свядомасць. Першы ўзровень ахопліваў усіх грамадзян Рэчы Паспалітай, якія называліся палякамі. Другі ўзровень – «каронныя» і літвіны. У XIX стагоддзі сярод літвінаў пачалі вылучаць этнічных літвінаў, беларусаў, а таксама інфлянтцаў [5, с. 34]. Адзін чалавек мог адначасова (сама)характарызавацца як бе-

ларус (рэгіянальнае паходжанне), русін (прыналежнасць да праваслаўнай – «рускай» канфесіі), ліцвін (выхадзец з тэрыторыі ВКЛ) і паляк (гэта значыць – шляхціц). На думку В. Насевіча, тэрмін «Літва» быў не толькі літоўска-беларускім палітонімам, але адначасова адным з агульных літоўска-беларускіх субэтнонімаў, што адыграў пэўную ролю ў этнагенезе абодвух народаў [6, с. 99].

Ліцвінская шляхта мела ўласную этнагенетычную міфалогію (Длугаш, Стрыйкоўскі, М. Літвін) і падкрэслівала сваё адрозненне ад «кароннікаў». Але ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай была зліквідавана палітыка-адміністрацыйная аўтаномія ВКЛ, а разам з тым і кансалідацыйны чыннік у фармаванні Natio Lithuanus – ліцвінскай шляхты, надэтнічнай прывілеяванай супольнасці, значную частку якой складалі нашчадкі «русінаў» (беларуска-ўкраінскае насельніцтва ВКЛ). У выніку на пачатку XIX стагоддзя ліцвіны, як піша І. Чаквін, былі вымушаны змяніць сваю гістарычную форму самавызначэння [7, с. 197]. Рознаэтнічныя групы, што ўтваралі гэтую супольнасць, ужо не мелі ані культурнай, ані дзяржаўна-палітычнай формы для падтрымання сваёй агульнай ідэнтычнасці.

У 40 – 50-я гады XIX стагоддзя імя «Літва», якое дагэтуль азначала ўсе землі, што ўваходзілі ў склад ВКЛ, рэдукуецца да назвы гісторыка-культурнага рэгіёну ў шэрагу іншых зямель былога ВКЛ. Межы «Літвы» У. Сыракомля вызначае наступным чынам: «старая мяжа Літвы... хоць і страціла сваё палітычнае значэнне, не пераставала, аднак, існаваць, бо ў польскія часы стала мяжой Наваградскага і Мінскага ваяводстваў, у нашы ж часы аддзяляла Гродзенскую губерню ад Мінскай, а сёння падзяляе Мінскі і Наваградскі паветы» [3, с. 179]. Этнонім «ліцвіны» пераважаў сярод насельніцтва Гродненскага, Ваўкавыскага, Слонімскага і часткова Слуцкага ўездаў. Этнонім «беларусы» ў найбольшай ступені быў распаўсюджаны ў Віцебскім, Дісненскім, Лепельскім і Полацкім уездах Віцебскай і ў Магілёўскай губернях [4, с. 83].

Дзякуючы гістарычным працам прадстаўнікоў Віленскага універсітэта сярод польскамоўнай інтэлігенцыяй пашырылася меркаванне пра прыярытэтнасць удзелу балтамоўных плямёнаў у разбудове літоўскай дзяржаўнасці. Высновы навукоўцаў ахвотна папулярызаваліся прадстаўнікамі рамантычнай плыні краёвай польскамоўнай літаратуры. Пра гэта пісаў у сваіх прадмовах да гістарычных паэмаў «Гражына» і «Конрад Валенрод» А. Міцкевіч [8, с. 10 – 20].

Ліцвінская польскамоўная інтэлігенцыя (Нарбут, Анацэвіч, Ярашэвіч) фактычна паклала падмурак ідэалогіі маладога летувіскага этнічнага руху. Але іх уплыў быў ускосны, наўпроставага ўдзелу ў праектах этнічнага абуджэння летувісаў шляхецкая інтэлігенцыя не прымала [9]. На думку І. Бабкова, этнічны літоўскі праект, які нарадзіўся напачатку XIX стагоддзя, паставіў пад пытанне легітымнасць выкарыстання тэрміну «Літва» ў дачыненні грамадска-палітычных праектаў польскамоўнай інтэлігенцыі краю [10, с. 149]. З другога боку, мясцовая праваслаўная інтэлігенцыя таксама пачала аргументавана аспрэчваць правамернасць выкарыстання тэрміна «Літва» на тэрыторыях, заселеных славянамоўным насельніцтвам [11, с. 121]. Разам з тым і пасля падзелаў Рэчы Паспалітай ды ўзнікнення ўласналетувіскага этнічнага руху сярод часткі шляхецкай інтэлігенцыі працягваў культывавацца полікультурны, надэтнічны ў сваёй сутнасці, ліцвінскі патрыятызм. Ліцвінская інтэлігенцыя ўважала сябе нашчадкамі дзяржаўна-палітычнай традыцыі Рэчы Паспалітай, карысталася польскай мовай, падзяляла каштоўнасці шляхецкай культуры і каталіцкага касцёлу, але адначасова мела выразнае ўяўленне пра гісторыка-культурную адметнасць Літвы як рэгіёна Рэчы Паспалітай і самакаштоўны характар народнай культуры насяляючых яе аўтахтонных народаў.

А. Кіркор так сфармуляваў сваё патрыятычнае крэда: «Я ліцвін, і ніколі гэта пачуццё ў ва мне не будзе знішчана. Я люблю сваю радзіму з усім юначым энтузіязмам, з усёй мужчынскай самаахвярнасцю. Маю сэрца і адчуваю сімпатыю да Польшчы настолькі, наколькі яе лёс звязаны з нашым» [12, с. 341]. Іншы прадстаўнік ліцвінскай інтэлігенцыі Я. Чачот пісаў: «Цяпер арэнбургская лінія, можна сказаць, запруджана палякамі (так нас называюць тут і за такіх прымаюць)» [13, с. 306]. Чачот дыстанцаваўся ад палякаў, але ў сваіх развагах аб беларускай мове ён захоўвае дыстанцыю і да беларускага сялянства. На думку Г. Бяссонава, «ліцвінскасць» краёвых дзеячоў 40 – 50-х гадоў была пэўным кампрамісам паміж іх запольскім выхаваннем і ўсведамленнем правоў «літоўска-рускага» народу на гісторыю і культуру гэтай зямлі [11, с. 58 – 59], што ўспрымалася часам польскімі патрыётамі як здрада.

У паэме Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» [14] тэрмін «ліцвін» – азначэнне такога ж парадку, што і «мазур» – гісторыка-этнаграфічнае. І ліцвіны, і мазуры, і яўрэі ў Міцкевіча называюцца адначасова палякамі, то бок ураджэнцамі, а перад усім патрыётамі колішняй Рэчы Паспалітай. Як піша Т. Венцлава: «Ягоная (Міцкевіча) надэтнічная ідэнтычнасць, калі знікала розніца між мовай і веравызнаннем, ахоплівала габрэяў, татараў і нейкіх нявызначаных людзей простага стану, што размаўлялі ці то па-беларуску, ці то па-літоўску» [15]. Калі Літва Міцкевіча, чые грамадскія пачуцці былі закансерваваныя эміграцыяй, – гістарычная правінцыя Польшчы, то ўжо для Крашэўскага Літва – самабытны край, які чакае свайго абуджэння. Разам з тым, за рэдкімі выняткамі ў асяродку ідэалагічна заангажаваных інтэлектуалаў,

кшталту Кіркора ці Крашэўскага, літоўскасць тутэйшай шляхты з'яўлялася складовай часткай агульнапольскага патрыятызму.

Перыядычна ўзнікалі праекты аднаўлення ВКЛ, але варта памятаць пра іх палітычна-кан'юктурны аспект. Планы аднаўлення ВКЛ наконадні вайны з Напалеонам бачыліся іх аўтарам толькі прамежкавым этапам перад аднаўленнем польскай дзяржаўнасці. Вядомы план Агінскага прадугледжваў, напрыклад, увядзенне польскай мовы як мовы справаводства ў адноўленым ВКЛ [16]. Можна ў гэтым звязку, маючы на ўвазе сучасныя дыскусіі ў беларускім друку, згадаць словы А. Латышонка: «…мы не можам лічыць літоўскі сепаратызм, у адносінах да палітычнай дамінацыі польскае Кароны, папярэднікам беларускай нацыянальнай свядомасці» [17, с. 9].

Прычыны аслаблення нацыянальнага імунітэту ліцвінаў у дачыненні польскай культуры вынікаюць з папярэдняга гістарычнага перыяду. Носьбіты ліцвінскай шляхецкай ідэнтычнасці ў адрозненні ад праваслаўнай «русінскай» шляхты былі калісьці лепш інтэграванымі ва ўладныя інстытуты Рэчы Паспалітай і больш падпадалі рацыям рэчпаспалітаўскага патрыятызму. А. Валіцкі лічыць, што прыняцце сармацкай тэорыі дапамагло паланізацыі няпольскай шляхты [18, с. 161]. Пра дэнацыяналізуючы эфект «сармацкай» ідэалогіі ў дачыненні этнічнай свядомасці няпольскай шляхты піша і беларускі гісторык І. Чаквін [7, с. 195]. На думку А. Катлярчука, змены ў этнакультурнай арыентацыі мясцовых элітаў адбыліся ў выніку войнаў сярэдзіны XVII стагоддзя, пад час якіх каталіцкія магнацкія кланы звінавацілі пратэстантаў у здрадзе на карысць Швецыі, праваслаўных – у калабарацыі з маскоўскай дзяржавай. Вынікам стала маргіналізацыя праваслаўных і пратэстанцкіх палітычных колаў Княства, навяртанне значнай колькасці дысідэнцкай шляхты ў каталіцтва. У грамадскай думцы адбыўся пераход ад літвацэнтрызму да польскага рэгіяналізму, формулай якога стала: «gente Lithuanus (Ruthenus), natione Polonus» [19]. Канец развіцця ліцвінскай культуры І. Вуглік адносіць да сярэдзіны XIX стагоддзя, якому папярэднічала закрыццё Віленскага універсітэта, скасаванне магдэбургскага права, Статута ВКЛ і падаўленне паўстання пачатку 30-х гадоў: «Ад гэтых часоў яе (ліцвінскай культуры – *С.Ш.*) прытулак – шляхецкія маёнткі, што жывуць па-большасці культурнай памяццю, успамінамі, асобныя лакуны ў здэкультываваных ці іншаэтнічных гарадах з рэфлексіяй «краёвасці», «тутэйшасці» [20]. Пасля 1860-х гадоў, як заўважае П. Церашковіч, тэрміны «ліцвіны», «літоўцы» ў дачыненні беларусаў Мінскай, Віленскай і Гродненскай губерняў знікаюць з афіцыйных дакументаў [4, с. 79].

Як сінонім паняцця «шляхціц» у Рэчы Паспалітай ужывалася азначэнне «паляк». Яно адлюстроўвала саслоўны статус [21] і дзяржаўнае падданства яго носьбітаў, іх дастасаванасць да палітычнага жыцця дзяржавы. Іншымі словамі, дэфініцыя «паляк» утрымлівала ў дачыненні шляхты Беларусі і Літвы за часамі існавання Рэчы Паспалітай не этнакультурны, а палітычна-дзяржаўны, саслоўна-канфесійны змест. Як піша польскі даследчык А. Валіцкі: «Панятак "бытнасці палякам" пачаў выразна асацыявацца са шляхецкім статусам» [18, с. 162]. Са стратаю рэшты дзяржаўнай аўтаноміі ВКЛ пасля падзелаў Рэчы Паспалітай тэрмін «паляк» пачаў больш актыўна ўжывацца як саманазва шляхтай Беларусі. Большасць шляхціцаў была нашчадкамі карэннага насельніцтва і працягвала захоўваць культурную і моўную беларускую спецыфіку [4, с. 90]. Але са стратаю незалежнасці Рэчы Паспалітай узрасла грамадская лаялнасць да сімвалаў гэтай дзяржавы, актыўна пашыраліся «агульнапольскія» салідарыскія настроі. Інэрцыя грамадскай свядомасці ў выкарыстанні палітоніма «паляк» свядома замацоўвалася ўжо ў якасці этноніма рупнасцю польскамоўных інстытутаў адукацыі ды касцёла, а з другога боку, палітыкай расійскіх уладаў, якая мела зацікаўленасць менавіта ў такой форме самавызначэння мясцовай шляхты дзеля апраўдання каланіяльных захадаў па выцісканню прадстаўнікоў тутэйшых прывілеяваных саслоўяў з гаспадарчага жыцця краю.

Напрыканцы XVIII – напачатку XIX стагоддзяў польскай інтэлігенцыяй (Калантай, Чацкі, Чартарыйскі) робяцца энергічныя захады па трансфармацыі феадальнай саслоўнай ідэнтычнасці natio Polonus і выбудове на яе аснове агульнанацыянальнай этнакультурнай польскай свядомасці. Гэтым задачам паслугуюцца рэфармаваная сістэма адукацыі, касцёл, тэатр, СМІ. Урадавая палітыка расійскіх манархаў Паўла І і Аляксандра І не замінала польскай эліце праводзіць падобную працу сярод літоўска-беларускай шляхты. Пазней, на эміграцыі, князь А. Чартарыйскі характарызаваў сваю місію ў ранзе папячыцеля Віленскай навучальнай акругі як заданне па стварэнню ў краі адукацыйнай сістэмы «ў нацыянальным духу» [22, с. 312]. Пра адмысловую ролю Віленскага універсітэта ў апалячванні беларускай (ліцвінскай) шляхты выказваліся і сучаснікі [23, с. 28]. Асабліва інтэнсіўна трансфармацыя ідэнтычнасці праходзіла на эміграцыі [24, с. 66]. Прыкладам можа слугаваць постаць Аляксандра Рыпінскага, ураджэнца Падзвіння (1811 – 1886), аўтара этнаграфічнай працы «Беларусь. Некалькі слоў аб паэзіі простых людзей гэтай нашай польскай правінцыі, аб яго музыцы, песнях, танцах і г.д.» (1840). У гэтай працы, напісанай за межамі радзімы, Рыпінскі звяртаецца, у прыватнасці, да беларусак з заклікам не даваць дзецям ежу пакуль не папросяць яе па-польску [25, с. 10 – 11]. Пасля вяртання на Бацькаўшчыну запольская экзальтацыя А. Рыпінскага

лагаднее. «Можа дарэмна мы горнемся да гэтай няшчаснай Польшчы», – піша ён у больш познія гады ў сваім лісце да А. Плуга [26, с. 176].

Змена этнічнай свядомасці магла адбывацца на працягу жыцця аднаго чалавека неаднойчы, што, паводле П. Церашковіча, не з'яўляецца незвычайным для пачатковых перыядаў развіцця нацыянальных рухаў. Церашковіч прыводзіць прыклад эвалюцыі поглядаў М. Баброўскага і І. Даніловіча, якія ў 1815 – 1817 гадах выступалі як лідэры беларускага руху. Пазней М. Баброўскі перайшоў на пазіцыі протазападна-русізма, а ў Даніловіча абудзілася ўкраінская ідэнтычнасць [4, с. 72 – 73]. Для прадстаўнікоў інтэлігенцыі, што на працягу жыцця маглі некалькі разоў змяняць вызначэнне сваёй этнічнай прыналежнасці, як зазначае Ю. Бардах, працэс асіміляцыі саступаў месца свядомаму выбару [5, с. 76]. Апошняе правамернае ў дачыненні першапачатковага этапа разгортвання нацыянальных рухаў, пакуль прадукаванне нацыянальнай свядомасці не зрабілася справай сямейнага выхавання. Першая генерацыя культурных дзеячоў нацыянальнага тыпу (Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч, К. Каліноўскі) сапраўды прыходзіла да беларускасці (польскасці або расійскасці) «ў выніку працяглых роздумаў» [27, с. 146]. Вядома, падобны разумовы працэс не мог набыць шырокага распаўсюду. Таму новы (нацыянальны) тып этнічнай свядомасці распаўсюджваўся ў масах павольна.

Працэсы нацыянальнага самавызначэння закранулі ў першай палове XIX стагоддзя найперш шляхецкую інтэлігенцыю, фармаванне ідэнтычнасці якой зазнала ідэалагічны ўплыў сталічных універсітэцкіх асяродкаў, палітычных салонаў Вільні, Варшавы, Пецярбурга і Масквы, эміграцыйных гурткоў. Асобы, якія валодалі меншай інтэлектуальнай мабільнасцю, працягвалі і надалей укладаць у тэрміны «паляк» або «літвін» надэтнічны – саслоўны ці канфесійны змест. Шляхецкую ідэнтычнасць падобнага кшталту, гэтаксама як і сялянскую, можна вызначыць тэрмінам «тутэйшы». Падобнае самавызначэнне нельга лічыць сведчаннем адсутнасці грамадскай пазіцыі. Як піша Ю. Бардах, «у некаторых асяроддзях айчыннай шляхты і пашляхецкай інтэлігенцыі «тутэйшасць» – у сэнсе прымату рэгіянальнага элементу – мела выраз свядомай апазіцыі тагачаснай нацыянальнай свядомасці, якой процістаўлялася гістарычная свядомасць Вялікага Княства. Гэта была традыцыя, якая прадугледжвала суіснаванне разнародных элементаў» [5, с. 152]. Сярод апошніх былі таксама кампаненты, што ўзыходзілі да рэгіянальна-племянных этнакультурных традыцыяў ранняга сярэднявечча.

Шляхта Беларусі (гэта датычыць не толькі шляхціцаў славянскага паходжання, але, напрыклад, і татараў) у сваёй масе валодала беларускай (русінскай) і польскай мовамі. У першай палове XIX стагоддзя польская мова заставалася мовай друкарскага варштату – адукацыі, касцёла, справаводства. Патрэба быць пачутым культурна-палітычнай элітай вымагала канвенцыйных шляхоў артыкуляцыі праблемы. Як пісаў Я. Баршчэўскі: «Не кожны чытач зразумее беларускую мову» [30, с. 26]. Пры статыстычных апытаннях на працягу XIX стагоддзя рэгістраваліся выпадкі іменавання польскай мовы «панскай» [28, с. 112]. Як піша Ю. Бардах, «польская мова мела характар адрозніка, які сведчыў аб прыналежнасці да шляхецкага грамадска-культурнага кола» [5, с. 137]. Вось характарыстыка моўнай сітуацыі ў шэрагах дробнага шляхецтва, якую даў А. Рыпінскі: «А хочаце ведаць, на якой мове размаўляе пан шляхціц? Гэтага ён і сам не ведае! Чытаць не ўмее, друкаванага не церпіць, падпісваецца не па-шляхецку, бо толькі крыжыкам або, што ўжо па-вучонаму, якімсьці кручком, якога і не пазнае; размаўляе на дыялекце, прынятым у ваколіцы: казацкім, жыдоўскім, татарскім, маскоўскім, рускім, яму ўсё роўна! – бо заўсёды да яго прымешвае пару польскіх словаў, якія яму ў спадчыну ад прадзедаў яшчэ засталіся. Яны лепшы довад шляхецтва, як і збуцвелы дыплом пад страхою» [24, с. 67]. Сапраўды, для значнай колькасці дробнай шляхты знаёмства з літаратурнай пальшчызнай абмяжоўвалася чытаннем календароў [11, с. 91].

Пальшчызна беларускай шляхты часам прыводзіла этнічных палякаў у подзіў, як гэта адбываецца і дасюль з каментатарамі творчасці А. Міцкевіча. «Мова, якую ўжываў Міцкевіч не толькі ў штодзённым жыцці ды ў лістах, але і ў паэзіі, не была моваю ва ўсіх яе асаблівасцях спрадвечна польскаю, а была моваю правінцыйнаю», – піша польскі даследчык спадчыны Міцкевіча Г. Корбут, – «каб добра зразумець мову Міцкевіча... належыць, перадусім, даследаваць гутарковую мову палякаў, якія жылі на беларускіх ды літоўскіх абшарах у часы Міцкевіча, акрэсліць адносіны гэтае мовы да беларускае з аднаго, а літоўскае з другога бакоў» [8, с. 210 – 213]. Пра наяўнасць вялікай колькасці беларускай лексікі – «дыялектызмаў, правінцыялізмаў і перыферычных архаізмаў» – гаворыцца ў дачыненні творчай спадчыны Ул. Сыракомлі [3, с. 11]. М. Хаўстовіч у гэтым звязку кажа пра адмысловы варыянт польскай мовы, які склаўся ў побытавым камунікаванні беларускай шляхты [24, с. 6]. Сучасныя даследчыкі-дыялектолагі, палякі і беларусы, выказваюць меркаванне, што тутэйшая польская мова сфармавалася ў выніку «ўзаемадзеяння розных моў пры засваенні польскай мовы як другаснай» [29, с. 19].

Падтрымка рэчпаспалітаўскага вызваленчага руху сярод шляхецкай грамады Беларусі насіла непаслядоўны характар. Удзел беларускай шляхты не быў масавым ані ў шыхтах напалеонаўскага войску [31, с. 420], ані пад час Лістападаўскага паўстання (1830 – 1831) [32]. Але гэта не абараніла мясцовае

насельніцтва ад пераследу царскай адміністрацыі [33, с. 11]. У выніку дзейнасць польскіх актывістаў прыводзіла да ўзмацнення рэпрэсіўных мерапрыемстваў царызму, што стрымлівала фарміраванне беларускай самасвядомасці [12, с. 348]. А. Рыпінскі так характарызуе грамадзянскую пазіцыю дробнага беларускага шляхецтва: «пра Польшчу, пра Айчыну, пра службу карысную дзеля краю не кажы нічога, бо, як шляхціц, ён да ўсяго гэтага не мае дачынення! Рэкруцтва не ведае, падаткаў не плаціць, яму б толькі за чынш заплаціць хапіла. Абуе сабе на адну стары бот, з якога пальцы свецяцца, а на другую сякі-такі лапаць – і хоць яго за гэта ашмянскім шляхціцам назавуць – заўсёды ён Вашэць і ролі гэтае не саромеецца (адно, за што яго можна пахваліць), пасвіствае сабе за плугам або з касою ў руках, якую пэўна не прынясе ў аніводнае паўстанне за волю Польшчы...» [24, с. 66]. Падобны стэрэатып быў дастаткова распаўсюджаны, каб патрапіць і на старонкі тагачасных літаратурных твораў [34, с. 218]. Прахалодныя адносіны «да польскай справы» больш выразна выяўляліся на ўсходзе Беларусі. В. Жукоўскі сведчыць: «шляхта, асеўшая ў Белай Русі, па-польску не гавора, ... русіфікавалася і абыякава ставіцца да ўсяго, што датычыць польскай нацыянальнасці» [4, с. 138].

З. Шыбека вылучае тры этапы развою рэчпаспалітаўскага, «польскага», па тагачаснай тэрміналогіі, патрыятызму на землях былога ВКЛ. Найбольшую падтрымку ідэі адраджэння Рэчы Паспалітай мелі сярод шляхты Беларусі ў 1795 – 1830 гадах. У 1831 – 1863 гады адбываецца перафармуляванне ідэалу аднаўлення Рэчы Паспалітай. На гэтым этапе яна прадстаўляецца вялікапольскай інтэлігенцыяй ужо не як канфедэрацыя, а унітарная дзяржава. У гэтыя гады падтрымка «польскага руху» беларускай шляхтай пачынае зніжацца. Канчаткова маргіналізуецца гэтая ідэя пасля паражэння паўстання 1863 – 1864 гадоў [35]. В. Швед характарызуе 1794 – 1863 гады ў Беларусі як падрыхтоўчы перыяд выяўлення беларускай нацыянальна-культурнай ідэі. У гэты час праходзіла кансалідацыя беларускай нацыі на падставе лакальных супольнасцяў (ліцвіны і беларусы). Праявы нацыянальнай ідэі, на думку Шведа, назіраліся ў рамках ліцвінскага патрыятызму, які працякаў у рэчышчы польскага (рэчпаспалітаўскага) нацыянальна-вызваленчага руху [12, с. 346].

Фармаванню беларускай нацыянальнай ідэі спрыяла пераасэнсаванне ролі мовы ў этнічным самавызначэнні. На працягу першай паловы XIX стагоддзя захоўвалася перавага канфесійнай самасвядомасці над этнічнай [4, с. 83]. Але паступова павялічвалася разуменне месца мовы ў этнічнай самаідэнтыфікацыі. Віленскі генерал-губэрнатар князь Пётра Святаполк-Мірскі, праваслаўны беларус, даводзіў расейскаму ўраду, што беларусы-каталікі не палякі [19]. Падобнае меркаванне абгрунтоўваў П. Баброўскі: «Беларус-селянін, ці будзе ён праваслаўны, ці католік, мае свае перакананні, сваю маральную філасофію і перадае гэта разам з мовай сваім дзецям і ўнукам. Ксёндз і памешчык ніколі не скажуць аб беларусу каталіцкага веравызнання, што ён беларус, а скажуць ліцвін. Пагутарыце з гэтым ліцвінам, і вы пачуеце беларускую гаворку» [12, с. 342]. З сярэдзіны XIX стагоддзя афіцыйныя расійскія колы пачынаюць адносіць сялян-каталікоў да беларусаў. У «беларускіх» уездах Віленскай губерні склад беларусаў-каталікоў даходзіў да 52 %, а ў Магілёўскай – да 2,2 % [4, с. 83]. Насуперак стэрэатыпам беларуская шляхта не была цалкам каталіцкай. Так, у Мінскай губерні, паводле статыстычных звестак, да 30 % дробнай шляхты 60-х гадоў XIX стагоддзя былі праваслаўнымі [4, с. 92].

Да творчасці на беларускай мове ў першай палове XIX стагоддзя звяртаюцца і прадстаўнікі каталіцкай шляхецкай інтэлігенцыі. А. Пыпін характарызаваў іх свядомасць наступным чынам: «...этот патриотизм был “белорусский”, но сущность его была польская. Он был белорусский по любви к территориальной родине, ее пейзажам и бытовой обстановке, но вся жизнь самого белорусского народа понималась с чисто польской точки зрения: этот народ играл только служебную роль» [11, с. 87]. Блізкія высновы выказвае і Р. Радзік: «Для літарататараў, што пісалі і размаўлялі па-польску, іх беларускамоўная творчасць – найчасцей маргінальная адносна польскасці – была часам забаваю, але нярэдка, аднак, мела больш глыбокія матывы: пазнавальныя, навуковыя, сацыяльныя, але, напэўна, не свядома сепаратыстычныя» [36]. Ф. Турук разглядаў беларускамоўную творчасць Чачота, Вярыга-Дарэўскага, Рыпінскага як спробу пашырэння польскай прапаганды сярод беларускага сялянства [37, с. 8].

Але мы маем сведчанні, якія пераконваюць, што беларуская інтэлігенцыя першай паловы XIX стагоддзя была заангажаваная ў беларушчыне не толькі інтэлектуальна, але і эмацыйна. Так, Яна Баршчэўскага сучаснікі характарызавалі як «шчырага беларуса» [12, с. 340]. Дунін-Марцынкевіч свае беларускія сімпатыі тлумачыў наступным чынам: «Жывучы сярод народа, які гаворыць на беларускай мове, звязаны целам і душой з яго складам думак, разважаючы аб лепшай долі гэтага братняга народа, які закаснеў у адсталасці і цемры, рашыў я абудзіць яго цікаўнасць да асветы, у духу яго звычаяў, паданняў, легенд і схільнасці душэўнай пісаць на яго роднай мове» [12, с. 338]. Падобныя думкі выказвае і П. Шпілеўскі: «...я любіў гэтых добрых людзей, я знаходзіў радасць у іх павольнай, лянівай размове, у іх песнях, прымаўках і прыказках... Колькі новага, невядомага мне за школьнай партай я даведаўся ў гэтым народным вучылішчы, багатым разнароднымі прадметамі і навукамі аб роднай зямлі і мове, аб старажытным жыцці-быцці продкаў...» [38, с. 38].

Логіка змагання польскай і рускай нацыянальных ідэй змушала варагуючыя бакі апеляваць да беларускага сялянства. Этнаграфічныя экспедыцыі імператарскіх навуковых таварыстваў і гісторыка-філалагічныя публікацыі па беларусістыцы, санкцыянаваныя Пецярбургам, пракламацыі і «гутаркі» на беларускай мове, што ствараліся польскамоўнымі рэвалюцыянерамі, ускосна мацавалі ўласнабеларускую ідэнтычнасць, спрыялі інтэнсіфікацыі працэсаў этнічнага самавызначэння беларусаў, і гэта тычылася не толькі сялянства, але і дробнай шляхты. Непасрэдны ўплыў на этнічныя працэсы ў Беларусі аказвала расейская адміністрацыя. П. Керашковіч указвае на неадназначнасць яе палітыкі: «З аднаго боку, яна замінала фармаванню і распаўсюду нацыянальнага руху, з другога – "канструявала" беларускасць» [4, с. 140]. Амбівалентныя бакі русіфікацыі аналізуе М. Хаўстовіч: «Русіфікацыя прымусіла палітычных «палякаў» па-іншаму глянуць на сваё паходжанне, заняцца пошукамі сваіх каранёў. І шмат хто зразумеў, што нічога агульнага з этнічнымі палякамі яны не маюць» [24, с. 15].

Этнічная эмансіпацыя беларусаў адбывалася, як правіла, пад час навучання ў Расіі. Каб паўстаць, беларуская ідэнтычнасць павінна была адасобіцца ад усяго, што замінала ўсведамленню ўласных нацыянальных інтарэсаў. На пачатковым этапе беларускасць шляхты азначала разуменне – «мы не палякі, не літва». Як пісаў А. Цвікевіч: «Крытычным недахопам беларусафілаў польскай культуры было тое, што яны прыходзілі да Беларусі з мэтай адарваць яе культурна і палітычна для Польшчы, тым часам як бела-русафілы, што выходзілі з расійскай культуры, што канчалі расійскі універсітэт, пісалі і думалі па-расійску, але адчувалі па-беларуску, мусілі акрэсляць і адрываць Беларусь ад Расіі для Беларусі» [39, с. 54]. З праваслаўнага асяроддзя выйшаў шэраг шчырых працаўнікоў на ніве беларускай культуры (Шпілеўскі, Насовіч, Раманаў, Нікіфароўскі, Сапуноў). Праваслаўная інтэлігенцыя, што цярпела і ад экзальтаваных праяваў рэчпаспалітаўскага патрыятызму і ад падазронасці расейскай каланіяльнай адміністрацыі пасля раздзелаў Рэчы Паспалітай, рабілася патэнцыйным рэзервам беларускага культурнага руху. Як піша польскі даследчык Р. Радзік: «Русіфікацыйныя працэсы хутчэй ішлі галоўным чынам сярод праваслаўных сялян, якія павысілі свой статус у грамадстве пасля скасавання прыгону, чым сярод праваслаўнай – наогул дробнай і беднай – шляхты, якая ў сваёй масе адыходзіла ад польскасці, якая пэўны час вагалася паміж польскасцю ды расейскасцю, але рэлігійна цягнулася да расейскае культуры, хоць традыцыйна была звязаная з польскасцю сваім саслоўным адрозненнем, якое аддзяляла беднага шляхціца ад селяніна» [40]. Як зазначыў М. Хаўстовіч: «Вызначыць сваю нацыянальную прыналежнасць беларусу было лягчэй, калі ён пакідаў родныя мясціны і трапляў у сталічныя расійскія гарады Маскву і Пецярбург. На Бацькаўшчыне зрабіць гэта – як ні дзіўна – было цяжэй, а на эміграцыі – амаль немагчыма: моцны польскі нацыянальна-вызваленчы рух у 30 – 40-я гг. XIX стагоддзя цалкам нейтралізаваў нараджэнне беларускага сепаратызму» [24, с. 64]. Зародкі этнічных рухаў узнікалі ў студэнцкім асяроддзі. Напрыклад, К. Каліноўскі, лідэр «літоўскіх сепаратыстаў» у паўстанні 1863 – 64 гадоў таксама атрымаў падобны досвед [41, с. 9].

Расійская палітыка фармавалася пад уплывам антаганістычных інтарэсаў розных групаў арыстакратыі (у тым ліку і польскай), што прыводзіла да адміністрацыйнай непаслядоўнасці. Гэта тычыць і афіцыйнага стаўлення да нацыянальнай палітыкі ў Беларусі. Напрыклад, забарона ўжываць тэрмін «Беларусь» у 40-я гады насіла неабавязковы характар і неўзабаве перастала выконвацца. А ў 1869 годзе ўлады дазволілі друкаваць на беларускай мове «грамадзянкай» этнаграфічныя зборнікі [42]. В. Швед вылучае 4 перыяды ў нацыянальнай палітыцы Расіі на далучаных тэрыторыях. Пры Кацярыне II да Беларусі ставіліся як да рускіх зямель. Паўлаўска-аляксандраўскаму перыяду былі характэрны паланафільскія тэндэнцыі. Русіфікацыю Беларусі ўзмацніў Мікалай I, а Аляксандр II зноў зрабіў паслабленні для «польскай справы» [12, с. 347]. Але пры ўсіх разыходжаннях у тактычных пытаннях існаваў пэўны кансэнсус, што датычыў бачання будучыні анэксаваных зямель. «Наша великая монархиня созидает дела вековые, и что веками было расторгнуто, то веками и соединяется. Здесь была некогда Русь – и будет со временем» – такое крэда расейскай палітыкі выказаў, паводле сведчання Ф. Булгарына, граф Ферзен [31, с. 76]. У гэтай барацьбе не датрымліваліся ідэалагічнага пурызму.

Напачатку XIX стагоддзя польскія і расійскія інтэлектуальныя колы пачалі ўсведамляць этнакультурную адметнасць беларусаў, але адсутнічала ўстойлівая тэрміналагічная традыцыя, якая б дазваляла пазначаць беларускую этнічную прыналежнасць. Напрыклад, Адам Міцкевіч называў беларускую мову «русінскай або літоўска-русінскай», Ян Чачот – «славяна-крывіцкай». У 30-х гадах XIX стагоддзя адбываецца грамадскае абмеркаванне, у выніку якога мова сялянства (як праваслаўнага, так і каталіцкага) «Северо-Западного края» апазнаецца як беларуская [24, с. 17]. Беларускай прызнаецца таксама мова, на якой ствараліся дакументы ў канцылярыі вялікіх князёў літоўскіх [43, с. 218]. Як пісаў Ул. Сыракомля: «Пекная гэта галіна славянскай мовы – той крывіцкі дыялект – і старая! Бо гэта мова нашага Літоўскага статута і заканадаўства на працягу двух стагоддзяў – XVI і XVII. І пашыраная! Бо смела можна сказаць, што на ёй размаўлялі тры чвэрці даўняй Літвы, народ, шляхта і паны» [3, с. 492]. Геаграфічная лакалізацыя тэрміна «Беларусь» у яго сучасным разуменні адбылася толькі напрыканцы XIX стагоддзя [44, с. 20]. Прычыну экспансіі гэтага першапачаткова рэгіянальнага вызначэння на

астатнюю этнічную тэрыторыю беларусаў М. Піліпенка тлумачыць тым, што з уваходжаннем беларускіх зямель у склад Расейскай Імперыі і развоем уласнаўкраінскага нацыянальнага руху з'явілася неабходнасць адрознівання беларусаў ад украінцаў, якія мелі ў ВКЛ агульнае азначэнне «русіны», а таксама ад вялікарусаў. Акрамя таго гэты тэрмін адрозніваў беларускі этнас ад балтамоўных літоўцаў. Колішнія ж тэрміны «ліцвіны» і «русіны» не давалі такой універсальнай магчымасці [43, с. 73].

Такім чынам, свядомасць прывілеяванага саслоўя Беларусі ў першай палове XIX стагоддзя зрабілася полем змагання польскай і расейскай нацыянальных ідэй. «Ліцвінскасць» польскамоўнай шляхецкай інтэлігенцыі як «пераходная культурная ідэнтычнасць» [10, с. 148] не спарадзіла нацыянальнага руху з прычыны псіхалагічнай непадрыхтаванасці мясцовай шляхты да прыняцця народнай этнічнай традыцыі і мовы. Кампрамісным выбарам, што дазваляў пазбегнуць разбуральнага для мясцовай мультыкультурнай традыцыі сутыкнення польска-расійскага нацыяналізму, была самаідэнтыфікацыя па рэгіянальнай прыкмеце – «тутэйшасць», адной з формаў якой напачатку XIX стагоддзя з'яўлялася беларуская ідэнтычнасць. Яе ідэалы мы сустракаем у творчасці Я. Баршчэўскага.

«Беларуская» свядомасць тутэйшага прывілеяванага саслоўя першай паловы XIX стагоддзя была далёкай ад нацыянальнага адраджэнскага канону «нашаніўскай» эпохі, пагатоў ад сучаснай беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці. Але ідэя беларускасці развівалася на працягу XIX стагоддзя менавіта ў асяроддзі прывілеяванага адукаванага саслоўя – шляхты-дваранства, святарства. «Заходна-русізм» Богуш-Сестранцэвіча, «тэрытарыялізм» Гераніма Друцкага-Любецкага і Рамана Скірмунта, «хлопаманія» Дуніна-Марцінкевіча і Вярыгі-Дарэўскага – ёсць вытокамі беларускай нацыянальнай ідэі. 65 тысяч беларускамоўных дваран (43,3 % ад агульнага складу шляхты), паводле рэканструкцыі П. Церашковіча на падставе перапісу 1897 года [43, с. 35], дастатковы аргумент, каб разглядаць генэзу гэтай прывілеяванай групы як складнік этнічнай гісторыі беларусаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Сміт Э. Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі. – Мінск: Беларускі Фонд Сораса, 1995. – 272 с.
2. Токць С. Беларуская ідэнтычнасць у XIX ст. [Electronic resource] / Mode of access: <http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/bzh/24/04.htm.>
3. Сыракомля У. Добрыя весці. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1993. – 526 с.
4. Терешкович П.В. Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: В контексте Центрально-Восточной Европы. – Минск: БГУ, 2004. – 223 с.
5. Бардах Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага княства Літоўскага. – Мінск: Бібліятэка часопіса «Беларускі Гістарычны Агляд», 2002. – 275 с.
6. Насевіч В. Да пытання пра саманазву беларусаў у перыяд ВКЛ // Беларусіка-Albarutenica. Кн. 2 / Рэд. А. Анціпенка і інш. – Мінск: Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны, 1993. – С. 97 – 100.
7. Беларусы: У 8 т. Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё / Рэд. В.К. Бандарчык і інш. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – 433 с.
8. XIX стагоддзе : Навукова-літаратурны альманах. Кн. 2 / Уклад. М. Хаўстовіч. – Мінск: БДУ, 2000. – 224 с.
9. Снайдэр Т. Рэканструяваньне нацыяў [Electronic resource] / Mode of access: <http://snyder.litvin.org/>
10. Бабкоў І. Генэалёгія беларускай ідэі // Arche. – 2005. – № 3. – С. 136 – 165.
11. Пыпин А. История русской этнографии. Т. 4: Белоруссия и Сибирь. – Мінск: БелЭн, 2005. – 256 с.
12. Швед В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772 – 1863). – Гродна: ГрДУ, 2001. – 415 с.
13. Чачот Я. Выбраныя творы. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1996. – 374 с.
14. Міцкевіч А. Пан Тадэвуш. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. – 367 с.
15. Венцлава Т. Вяртаньне да роднага краю. [Electronic resource] / Mode of access: <http://www.lib.by/frahmenty/10venclova.htm.>
16. Ерашэвіч А. Палітычныя праекты адраджэння Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага ў палітыцы расейскага царызму напярэдадні вайны 1812 года [Electronic resource] / Mode of access: http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/almanach/06/06hist_jeraszevicz.htm
17. Латышонак А. Народзіны беларускай нацыянальнай ідэі // Спадчына. – 1992. – № 1. – С. 9 – 14.
18. Валіцкі А. Інтэлектуальныя эліты і зменлівыя лёсы «вымысленнай нацыі» ў Польшчы // Фрагмэнты. – 1999. – № 3 – 4. – С. 153 – 183.
19. Катлярчук А. Чаму беларусы не апанавалі літоўскай спадчыны [Electronic resource] / Mode of access: http://arche.home.by/2003-2/katl203.html

20. Вуглік І. У ланцугах табу: свабода, культура і рэпрэсіі ў гісторыі беларускага грамадства [Electronic resource] / Mode of access: http://www.lib.by/frahmenty/8vuhlik.htm.
21. Смалянчук А. Беларускія палякі або палякі ў Беларусі? [Electronic resource] / Mode of access: http://autary.iig.pl/smalanchuk/artykuly/palaki/palaki_by.htm
22. Чарторижский А. Мемуары князя Адама Чарторижского и его переписка с императором Александром I. Т. 1. – М., 1912. – 476 с.
23. Кісялёў Г. Героі і музы. – Мінск, 1982. – 255 с.
24. Хаўстовіч М.В. Гісторыя беларускай літаратуры 30 – 40-х гадоў XIX стагоддзя. – Мінск: БДУ, 2001. – 171 с.
25. Rypinski A. Bialorus. Kilka slow o poezji prostego ludu tej naszej polskiej prowincji, o jego muzyce, spiewie, tancach, etc. – Paryz, 1840. – 231 s.
26. Пачынальнікі: З гіст.-літар. матэрыялаў XIX ст. / Уклад. Г.В. Кісялёў. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 549 с.
27. Мірановіч Я. Навейшая гісторыя Беларусі. – Беласток, 1999. – 270 с.
28. Уікс Т. «Мы» ці «яны»: беларусы і імперская Расія ў 1863 – 1914 гады // Arche. – 2003. – № 2. – С. 107 – 119.
29. Кур'ян І. Беларуска-польскае моўнае памежжа. Праблема навуковага падыходу // Acta Albaruthenica: Навуковы зб. / Пад агульн. рэд. М. Хаўстовіча, А. Баршчэўскага, С. Запрудскага. – Мінск, 2005. – Вып. пяты: Права і эканоміка. – С. 17 – 22.
30. Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990. – 383 с.
31. Булгарын Ф. Выбранае. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003. – 592 с.
32. Філатава А. Польская нацыянальная ідэя на Беларусі ў XIX ст. [Electronic resource] / Mode of access: http://www.kamunikat.net.iig.pl/publ_radavod_filatava.htm.
33. Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. – Мінск: Полымя, 1997. – 270 с.
34. Жавускі Г. Успаміны Сапліцы. – Мінск: Лімарыус, 2005. – 368 с.
35. Шыбека З. Справа адраджэння Рэчы Паспалітай на землях Беларусі ў XIX ст. [Electronic resource] / Mode of access: http://www.kamunikat.net.iig.pl/publ_radavod_szybieka.htm
36. Радзік Р. Нацыянальнае ў літаратурнай беларушчыне ў міжпаўстанчы перыяд [Electronic resource] / Mode of access: http://www.khblit.narod.ru/pracy/radzik03.htm
37. Турук Ф. Белорусское движение. – Мн.: Белгеодезия, 1993. – 144 с.
38. Беларусы: У 8 т. Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння / В.К. Бандарчык. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – 365 с.
39. Цвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
40. Радзік Р. Паляк, літвін, беларус – эвалюцыя крытэрыяў нацыянальна-культурнай прыналежнасці ў два апошнія стагоддзі // Acta Albaruthenica. – Мінск, 2001. – Т. 2. – С. 12 – 18.
41. Кісялёў Г. Радаводнае дрэва. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. – 303 с.
42. Смалянчук А. Ліцвінства, заходнерусізм і беларуская ідэя. XIX – пачатак XX ст. [Electronic resource] / Mode of access: http://autary.iig.pl/smalanchuk/artykuly/ruch/licvinstva.htm
43. Запруднік Я. Дваранства і беларуская мова / Беларусіка-Albarutenica. Кн. 2 / Рэд. А. Анціпенка і інш. – Мінск: Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, 1993. – 403 с.
44. Ельскі А. Выбранае. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 496 с.